Дзіна ДУБІНІНА,

*кандыдат педагагічных навук,
дацэнт, загадчыца кафедры методык
дашкольнай адукацыі,
Беларускі дзяржаўны педагагічны
універсітэт імя Максіма Танка*

# НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫЯ ПАРАДЫ ПА АЗНАЯМЛЕННІ ДЗЯЦЕЙ З БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРАЙ І ФАЛЬКЛОРАМ

*У артыкуле раскрываюцца пытанні арганізацыі ва ўстанове дашкольнай адукацыі сумеснай мастацка-маўленчай дзейнасці педагога і дзяцей і самастойнай мастацка-маўленчай дзейнасці выхаванцаў.*

***Ключавыя словы:*** *дзеці, творы мастацкай літаратуры, мастацка-маўленчая дзейнасць, сеансы актывізуючых зносін, вершы, пераказванне, гульні-драматызацыі.*

*В статье раскрываются вопросы организации в учреждении дошкольного образования совместной художественно-речевой деятельности педагога и детей и самостоятельной художественно-речевой деятельности воспитанников.*

***Ключевые слова:*** *дети, произведения художественной литературы, художественно-речевая деятельность, сеансы активизирующего общения, стихи, пересказ, игры-драматизации.*

*The article describes the organization of pre-school education in the institution of joint artistic and voice of the teacher and the children and independent art-speech activity of pupils.*

***Key words:*** *children, works of literature, art-speech activity, the activation of dialogue sessions, poetry, narration, game-dramatization.*

**Уводзіны.** Мастацкія творы для дзяцей дашкольнага ўзросту — гэта адкрыццё вобразнага гучання слова, захапляючай чароўнай мелодыі мастацкага вобраза, паэтычнай рыфмы. Чароўныя радкі гукаў і слоў робяць успрыманне навакольнага свету яскравым, вобразным, малюнкавым.

У працэсе слухання твораў мастацкай літаратуры і фальклору ў дзяцей дашкольнага ўзросту назіраецца асаблівая цікавасць да гучання мастацкага слова. Яны адчуваюць яго мілагучнасць, рытмічнасць, заўважаюць і паўтараюць вобразныя выразы, удалыя і трапныя параўнанні.

З творамі мастацкай літаратуры і фальклору дзеці ў асноўным знаёмяцца ў адпаведнасці з адукацыйнай вобласцю «Мастацтва» (мастацкая літаратура) вучэбнай праграмы дашкольнай адукацыі.

**Асноўная частка.** Успрыманне твораў літаратурнага мастацтва дзецьмі дашкольнага ўзросту суправаджаецца маўленчай дзейнасцю, якая мае ярка акрэсленую мастацкую скіраванасць. Для яе вызначэння Л.Я. Панкратавай і А.Е. Шыбіцкай быў прапанаваны тэрмін «мастацка-маўленчая дзейнасць». У якасці асноўных кампанентаў мастацка-маўленчай дзейнасці вылучаюць: успрыманне мастацкага твора, яго элементарны аналіз, узнаўленне (рэпрадукцыя) і элементарная славесная творчасць, якая звязана з прыдумваннем казак, апавяданняў, загадак, рыфмаваных радкоў і інш.

Агульнай задачай мастацка-маўленчай дзейнасці ва ўстанове дашкольнай адукацыі з'яўляецца магчымасць праз літаратурны твор адкрыць дзіцяці свет слоўнага мастацтва, выхаваць цікавасць і любоў да кнігі.

Далучэнне дзяцей да мастацкай літаратуры і фальклору развівае ўменне слухаць і разумець твор, эмацыйна адгукацца на адлюстраваныя аўтарам падзеі, садзейнічаць і суперажываць героям, спачуваць ім.

Асноватворным у выхаванні будучага чытача з'яўляецца вызначэнне пласта дзіцячага чытання, якое, на думку З.А. Грыцэнка, залежыць ад узросту і прыхільнасцяў чытача, ад ведаў і інфармаванасці дарослых, ад стану і ўзроўню развіцця самой літаратуры.

Найбольш істотным крытэрыем адбору дзіцячых кніг з'яўляецца мастацкасць і цікавасць іх як для дзетак, так і для дарослых.

Перш за ўсё ў пласт дзіцячага чытання ўваходзяць творы вуснай народнай творчасці, у тым ліку казкі. Другой састаўной пласта дзіцячага чытання з'яўляюцца творы беларускай класікі, створаныя адмыслова для дзяцей, або тыя, што перайшлі з «дарослага» ў разрад «дзіцячага» чытання. Да іх, у першую чаргу, адносяцца творы Э. Пашкевіч, Я. Коласа, Я. Купалы і інш. Пра неабходнасць уключэння ў чытанне дзецям твораў пісьменнікаў-класікаў заўважаў Якуб Колас. На яго думку, пры кожным новым прачытванні гэтыя творы адкрываюць «усё новыя думкі, настроі, пачуцці, ідэі», таму «трэба як мага раней прывіваць дзецям прыхільнасць да гэтых пісьменнікаў», што можна зрабіць толькі непасрэдным чытаннем адпаведных твораў.

Трэцяй састаўной з'яўляюцца творы, якія спецыяльна напісаны для дзяцей пэўнага ўзросту дзіцячымі пісьменнікамі — В. Віткай, Э. Агняцвет і інш.

Пры адборы кніг абавязкова трэба ўлічваць, што літаратурны твор павінен выконваць пазнавальныя, маральныя і эстэтычныя функцыі.

Ва ўстанове дашкольнай адукацыі наладжваецца як сумесная мастацка-маўленчая дзейнасць педагога і дзяцей у час нерэгламентаванай дзейнасці, так і самастойная мастацка-маўленчая дзейнасць дзяцей.

Што да бацькоў, то чытанне і расказванне дзецям мастацкіх твораў павінна стаць штодзённым.

Сумесная мастацка-маўленчая дзейнасць педагога і дзяцей у час нерэгламентаванай дзейнасці прадугледжвае арганізацыю такіх форм работы, як гульні-драматызацыі; сеансы актывізуючых зносін па змесце мастацкіх твораў; сеансы актывізуючых зносін па разглядванні ілюстрацый да мастацкіх твораў; прагляд літаратурных перадач па тэлебачанні; правядзенне літаратурных віктарын і літаратурных ранішнікаў.

Самастойная мастацка-маўленчая дзейнасць дзяцей у асноўным накіравана на развіццё іх творчых здольнасцяў. Тут вызначальнымі формамі работы з'яўляюцца розныя віды настольнага тэатра, разглядванне ілюстрацый да мастацкіх твораў, самастойнае складанне цікавых кніг-карцінак з малюнкаў дзяцей, маляванне альбомаў у адпаведнасці са зместам мастацкага твора, гульні-драматызацыі па змесце мастацкіх твораў і інш.

Для авалодання дзецьмі мастацтвам успрымання літаратурных твораў і больш глыбокага спасціжэння іх зместу існуе цэлы шэраг спосабаў узаемазвязанай дзейнасці педагога і выхаванцаў, пры гэтым абавязкова ўлічваецца ўзрост дзяцей, іх жыццёвы вопыт, жанр твора. Гэта спосабы першапачатковай арыенціроўкі ў эмацыйна-вобразным змесце літаратурнага твора, цэласнага і дыферэнцыраванага падыходу да твора, самастойнага пошуку прыёмаў яго выразнага выканання, творчых адносін да літаратурных з'яў (С.Н. Чэмартан).

Першапачатковая арыенціроўка дзяцей у мастацкім творы пачынаецца з падрыхтоўкі іх да больш свядомага ўспрымання слоўнага мастацтва і вырашаецца з дапамогай такіх прыёмаў, як уступная гутарка, стварэнне гульнявых сітуацый, назіранне за прадметамі і з'явамі рэчаіснасці, выкарыстанне нагляднасці, аўдыёвізуальных відаў мастацтва і інш.

Выбар прыёмаў падрыхтоўкі дзяцей да ўспрымання мастацкага твора залежыць ад наяўнасці ў іх пэўнага вопыту, узроўню іх літаратурнай падрыхтоўкі, характару мастацкага твора.

Арыенціроўку дзяцей у мастацкім змесце твораў педагог забяспечвае іх выразным чытаннем або расказваннем. Падрыхтоўка педагога да чытання твора ўслых складаецца са звычайнай разбіўкі тэксту, вызначэння яго інтанацыйнай выразнасці. Для больш выразнага чытання педагогу неабходна прадумаць элементы артыстычнасці — міміку, жэсты, вызначыць тыя месцы тэксту, якія неабходна будзе скандзіраваць ці нават праспяваць.

Неабходна ўмела выкарыстоўваць магчымасці свайго голасу, пазбягаць раўнамерных націскаў. Расказванне казкі можа наогул насіць свабодны характар, але яно не выключае добрых ведаў на памяць і абавязковага выкарыстання тыповых казачных формул і зваротаў: зачыну, паўтораў, канцоўкі.

Чытаць ці распавядаць літаратурны твор трэба павольна, не спяшаючыся, каб дзеці мелі магчымасць асэнсаваць яго змест, адчуць прыгажосць мовы, на якой ён напісаны. На аснове арыенціроўкі дзяцей у змесце літаратурных твораў педагог накіроўвае ўвагу выхаванцаў на цэласны і дыферэнцыраваны падыходы да іх зместу.

Сумесная мастацка-маўленчая дзейнасць педагога і дзяцей арганізуецца так, каб успрыманне мастацкага твора адбывалася ў адзінстве яго зместу і мастацкай формы. Пры гэтым дзеці авалодваюць навыкамі і ўменнямі элементарнага эмацыйна-вобразнага аналізу твора, выказваюць сваё эстэтычнае стаўленне да яго.

Н.А. Старадубава адзначае, што здольнасць дзяцей да вобразнага аналізу мастацкага тэксту сама па сабе не фарміруецца. А калі яна адсутнічае, то дзеці ўспрымаюць толькі ўчынкі герояў, сочаць за ходам сюжэту і прапускаюць у творы ўсё цікавае. Менавіта таму, на яе думку, неабходна вучыць іх свядома ўспрымаць мастацкі твор, уменню пранікаць у яго сэнс.

Актыўнаму ўспрыманню дзецьмі мастацкага твора спрыяюць такія метады, як *гутарка пасля чытання, паўторнае чытанне, мадэляванне* і інш.

З мэтай актывізацыі дзяцей у працэсе мастацка-маўленчай дзейнасці выкарыстоўваюцца прыёмы, якія арганічна аб'ядноўваюцца з *гутаркай*. Шэраг такіх прыёмаў распрацаваны Л.А. Талер. Сярод іх вылучаецца так званы *ўяўны дыялог дзяцей з літаратурным героем*. Выхаванцам прапануюць звярнуцца да героя з пытаннямі, пры гэтым пажадана, каб яны самі сфармулявалі пытанні і далі адказы на іх ад імя героя.

Для больш дакладнага засваення этычнага і эстэтычнага зместу літаратурнага твора выхавальнік прапануе дзецям яго *паўторнае чытанне*. Пры гэтым неабходна памятаць, што вялікія па памеры мастацкія творы лепш аднаўляць не цалкам, а спыняючыся толькі на асноўных эпізодах.

Акрамя таго, ва ўсіх узроставых групах ў спалучэнні з гутаркай пасля чытання твора можна выкарыстоўваць элементы *драматызацыі*. Асаблівую значнасць гэты прыём набывае пры азнаямленні з казкай. Яе змест так можа зацікавіць дзіця, што яму адразу хочацца пераўвасобіцца ў казачных персанажаў, гаварыць іх мовай, выконваць іх дзеянні.

З мэтай больш глыбокага разумення і асэнсавання зместу мастацкага твора, асабліва казкі, ва ўсіх узроставых групах можна выкарыстоўваць *мадэляванне*. Адлюстраванне галоўных кампанентаў твора ў мадэлях-схемах спрыяе фарміраванню ў дзяцей здольнасці да аднаўлення паслядоўнасці развіцця сюжэту ў розных формах працы з тэкстам: *пераказ, сачыненне апавяданняў* і інш. (В.М. Дзьячэнка).

Развіццю навыкаў арыентацыі дзяцей у эмацыйнай пабудове твора, разумення яго зместу і запамінання паслядоўнасці эпізодаў, а таксама вызначэння асноўных сродкаў эмацыйнай выразнасці спрыяюць такія метады як *пераказ, імітацыя, драматызацыя*. Тую ж функцыю выконваюць наступныя метадычныя прыёмы: *слоўнае маляванне, слоўная гульня, складанне псіхалагічнай літаратурнай характарыстыкі героя і інш.*

*Пераказваць* літаратурныя творы дзеці могуць цалкам, па частках, ад імя аднаго з персанажаў, сумесна з педагогам, сумесна з іншымі дзецьмі, самастойна. Пераказваючы літаратурны твор, выхаванцы перадаюць логіку падзей, выкарыстоўваючы кампазіцыйныя сродкі мастацкай выразнасці, інтанацыйна выказваюць сваё стаўленне да галоўных герояў, ужываюць тыповыя слоўныя выразы, прыказкі і прымаўкі.

Значны ўплыў на самастойны пошук дзецьмі мастацкіх сродкаў выразнасці выканання літаратурнага твора аказвае *слоўнае маляванне*. Яно дапамагае дзецям лепш уявіць вобразы герояў твора або месца дзеяння, перадаць не фарбамі, а словамі іх рысы, знешні выгляд.

Прыём *славеснай гульні* дапамагае ўвайсці ў вобраз, у тыя абставіны, дзе адбываюцца падзеі. З яго дапамогай дзеці выказваюць свае ўяўленні аб тым, што яны ўбачылі, адчулі, перажылі.

Дзецям старэйшага дашкольнага ўзросту даступны і такі прыём як *псіхалагічны аналіз асаблівасцяў характару літаратурнага героя*. З захапленнем яны вызначаюць у тэксце пэўныя рысы яго характару.

У працэсе фарміравання ў дзяцей творчых адносін да літаратуры педагог дапамагае ім уяўляць тое, пра што распавядаецца ў творы, расказваць тэкст эмацыйна, праяўляць падчас расказвання сваё стаўленне да з'яў і падзей, складаць казкі, апавяданні, выкарыстоўваць у сваім маўленні трапныя выразы і вобразныя словы.

*Метад імітацыі* часцей за ўсё выкарыстоўваецца ў працэсе *гульняў-драматызацый па зместу літаратурных твораў*. Дзіця ў ходзе гульні паўтарае словы свайго героя і тым самым узбагачае сваё маўленне.

Сярод асноўных формаў арганізацыі мастацка-маўленчай дзейнасці вызначаюць ***сеансы актывізуючых зносін па азнаямленні з мастацкай літаратурай, літаратурныя ранішнікі.***

Сеансы актывізуючых зносін пачынаюцца з уступнай часткі, мэта якой — падрыхтаваць дзяцей да ўспрымання твора. Для гэтага выкарыстоўваюцца паказ вокладкі, малюнкі; напамін аналагічнага сюжэту; кароткая ўступная гутарка; выкарыстанне малых жанраў фальклору; прыгадванне знаёмых твораў пэўнага аўтара падобнага жанру; паказ прадметнай нагляднасці; элементы інсцэніравання, стварэнне гульнявой сітуацыі; пастаноўка праблемнага пытання; тлумачэнне незразумелых слоў і інш.

У асноўную частку ўваходзяць: само чытанне або расказванне мастацкага твора, гутарка з дзецьмі па зместу, сузіранне ілюстрацый, практыкаванне ў вобразнай гаворцы.

Асноўнай мэтай заключнай часткі зносін з'яўляецца вяртанне чытача непасрэдна да тэксту. Пажадана, каб у памяці дзіцяці застаўся сам мастацкі твор. Таму напрыканцы зносін лепш наладжваць паўторнае чытанне невялікіх твораў або найбольш упадабаных дзецям эпізодаў.

Зносіны ў працэсе азнаямлення з творамі мастацкай літаратуры маюць некалькі варыянтаў. Найбольш традыцыйны — азнаямленне дзіцяці з адным літаратурным творам.

Практыкуецца таксама аб'яднанне твораў аднаго літаратурнага жанру на адну і тую ж тэму. Такая пабудова дазваляе зацікавіць дзяцей да супастаўлення розных мастацкіх тэкстаў. У працэсе зносін дзеці маюць магчымасць аб'яднаць і параўнаць новыя карціны і вобразы з ужо вядомымі, асэнсаванымі раней.

Выкарыстоўваецца і іншае спалучэнне, якое прадугледжвае аб'яднанне адзінай тэмай твораў розных жанраў: апавяданне, верш, байка і г.д.

Найбольшую цікавасць выклікае ў дзяцей аб'яднанне твораў з процілеглымі сюжэтамі. Спалучэнне твораў, у якіх адлюстраваны кантрастныя характары або ўчынкі, дапамагае дзецям лепш зразумець іх станоўчую ці адмоўную якасць.

Напрыканцы года ў старшай групе можна праводзіць заняткі з дзіцячай кніжкай. Для гэтага неабходна, каб у кожнага дзіцяці была ўласная кніжка. Дзеці паказваюць вокладку, старонкі, называюць аўтара, назву кніжкі.

Азнаямленне з творамі на маральна-этычныя тэмы таксама праводзіцца ў выглядзе сеансаў актывізуючых зносін (А.Г. Арушанава, А.А. Смірнова). Матэрыялам для зместу гэтых зносін могуць выступаць сапраўдныя жыццёвыя сітуацыі і паводзіны акружаючых людзей, перш за ўсё, саміх выхаванцаў дзіцячага сада. Уплыў маральнага ўсведамлення дзіцяці на самарэгуляцыю яго паводзін яшчэ невялікі. Але дзеці старэйшага дашкольнага ўзросту ўжо могуць ацэньваць як свае паводзіны, так і паводзіны акружаючых людзей, таму тэмы для размовы ўключаюць адпаведныя для пэўнай узроставай групы паняцці: дабрыня, ветлівасць, беражлівасць, шчырасць. Тэмы размоў могуць быць канкрэтызаваны і дапоўнены ў залежнасці ад уяўленняў, узроўню выхаванасці дзяцей, папярэдняй працы з імі. Маральная выснова пры азнаямленні з такімі творамі робіцца самімі дзецьмі.

На думку В.Г. Бялінскага, тая мараль, што пакладзена ў мастацкі твор аўтарам, кажа заўсёды сама за сябе і адначасова ўздзейнічае сілай мастацкай выразнасці на пачуцці і свядомасць маленькага чалавека. Пры гэтым педагагічныя каментарыі, зразумела, неабходныя, але галоўнай мэтай у працы педагога з'яўляецца імкненне да таго, каб зносіны на этычныя тэмы абуджалі актыўнасць перажыванняў дзяцей, глыбокае асэнсаванне імі ўчынкаў, якія абмяркоўваюцца, і правілаў грамадскіх паводзін.

На думку А.А. Смірновай, дарасламу неабходна паказаць дзіцяці, што ў навакольным жыцці, у яго адносінах з людзьмі можна ўбачыць тыя ж праблемы, што і ў прачытаных мастацкіх творах. Пры гэтым педагогу пажадана самому быць актыўным удзельнікам размовы, выказваць свае думкі аб падзеях, распавядаць пра сябе і сваіх знаёмых, звярнуць увагу дзіцяці на яго самога, яго ўнутраны свет, даць магчымасць асэнсаваць і ацаніць свае дзеянні, адносіны, намаганні.

Цікавай формай азнаямлення дзяцей з літаратурным мастацтвам з'яўляецца правядзенне тыдня кніжкі, у якім могуць прымаць удзел дзеці ўсіх узроставых груп. Правядзенне такога тыдня мяркуе штодзённае азнаямленне выхаванцаў з новымі літаратурнымі творамі і іх героямі. Ва ўстанову дашкольнай адукацыі запрашаюцца пісьменнікі і паэты, праводзяцца літаратурныя ранішнікі, віктарыны, тэатральныя спектаклі, кніжныя выставы.

Асобна неабходна спыніцца на правядзенні літаратурных ранішнікаў. Яны могуць быць прысвечаны творчасці народных пісьменнікаў Беларусі (Я. Купала, Я. Колас), сучасным дзіцячым пісьменнікам (Т. Кляшторная, Н. Галіноўская), вуснай народнай творчасці («У госці да казкі») або якой-небудзь тэме («Зіма», «Вясна» і інш.).

На літаратурным ранішніку, прысвечаным творчасці пісьменніка, дзеці чытаюць вершы, спяваюць песні, драматызуюць урыўкі з любімых твораў. Вершаваныя тэксты чытаюць для дзяцей і дарослыя. Можна выкарыстоўваць тэхнічныя сродкі: паказаць відэафільм, урыўкі з кінафільма, праслухаць аўдыёзапіс, якія можна знайсці на сайце: http://youtu.be.

Літаратурныя ранішнікі праводзяцца 2—3 разы на год. Структура можа выглядаць наступным чынам: уступнае слова педагога пра жыццё і творчасць пісьменніка, паказ яго партрэта, кніг, чытанне твораў, пераказ казак, апавяданняў, зносіны па іх змесце, літаратурныя віктарыны, гульні-інсцэніроўкі па змесце знаёмых вершаў, апавяданняў, казак, тэатралізаваная дзейнасць (паказ настольнага, лялечнага тэатраў). Пажадана, каб ранішнік уключаў пералічаныя вышэй кампаненты, іх паслядоўнасць можа мець розныя варыянты. Педагог творча падыходзіць да прапанаванага матэрыялу.

Знаёмства з паэтычнымі творамі спрыяе развіццю ў дзяцей гармоніі, прыгажосці, здольнасці эмацыйна адгукацца на вобразную гаворку. К. Чукоўскі назваў працэс далучэння дзіцяці да паэтычнага славеснага мастацтва «вершаваным выхаваннем».

Знаёмства дзяцей з паэтычнымі творамі адбываецца не толькі ў працэсе змястоўных зносін, але і падчас падрыхтоўкі да каляндарных і народных святаў. Некаторыя вершы дзеці запамінаюць міжвольна падчас

кароткіх хвілінак паэзіі, у працэсе гульні, на прагулцы.

Аб'ём вершаваных тэкстаў для дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту значна большы чым для дзетак 3—4 і 4—5 гадоў. Пры гэтым неабходна ўлічваць індывідуальныя магчымасці кожнага дзіцяці.

Сеансы актывізуючых зносін па завучванні вершаў дзецьмі дашкольнага ўзросту маюць пэўную структуру. Спачатку пажадана падрыхтаваць дзяцей да ўспрымання паэтычнага твора. Затым педагог выразна чытае верш. Пасля невялікай паўзы ідзе яго паўторнае чытанне. Распавядаючы верш дзецям чацвёртага года жыцця, педагог абыгрывае яго асобныя радкі, суправаджае апавяданне вершаванага тэксту адпаведнымі дзеяннямі. Пасля знаёмства дзяцей з вершам, можна выклікаць 1—2 выхаванцаў, калі яны самі таго пажадаюць, паўтарыць верш самастойна. Пры расказванні верша дзецьмі асноўная ўвага педагога накіравана на іх стымуляванне расказваць далей, на падказванне слоў ці цэлых радкоў, якія дзіця не паспела запомніць.

З дзецьмі старэйшага дашкольнага ўзросту пасля першага чытання праводзіцца невялікая тлумачальная гутарка па змесце і форме паэтычнага твора, затым выхаванцаў папярэджваюць аб тым, што яны будуць завучваць верш на памяць. Пасля паўторнага чытання верш распавядаюць дзеці. Спачатку педагог звяртаецца да тых, хто запамінае хутчэй і лепш, а потым выклікае астатніх. Не рэкамендуецца харавое завучванне вершаў. На думку Л.І. Ціхеевай, чытаючы хорам, дзеці скандзіруюць вершы, адбіваюць рыфмы, набываюць адну і тую ж манеру крыклівага чытання, якое здымае ўсялякую індывідуальнасць.

Падчас знаёмства з паэзіяй педагог выкарыстоўвае разнастайныя прыёмы. Да іх адносяцца: *выразнае чытанне верша, шматразовае яго паўтарэнне, суправаджэнне чытання рознымі рухамі і дзеяннямі, паказ нагляднасці, гульнявыя практыкаванні.*

Асобна неабходна спыніцца на ўспрыманні дзецьмі дашкольнага ўзросту гумарыстычных вершаваных твораў. Педагог звяртае ўвагу дзяцей на смешныя радкі ў тэксце, але не займаецца іх падрабязным тлумачэннем, інакш смешнае перастае быць смешным. Вясёлае прымаецца не логікай, а асаблівым пачуццём гумару.

Псіхолагі адзначаюць, што для таго, каб палепшыць запамінанне вершаў, неабходна мяняць форму іх паўтарэння: *чытаць па частках, па ролях, уключаць чытанне верша ў гульню «Адгадай, хто гэта».* Для таго каб усе дзеці запомнілі верш, пажадана яго паўтараць у іншых відах дзейнасці. Вялікія па памеры вершы пажадана завучваць па частках. Спачатку педагог падводзіць дзяцей да разумення тэксту, чытае верш цалкам, потым паведамляе, што сёння дзеці будуць вучыць толькі частку верша, з якой і вядзе далейшую працу. У наступны раз зноў чытаецца ўвесь верш. Аднаго-двух дзяцей выклікаюць паўтарыць яго першую частку. Потым завучваецца другая палова верша, у канцы — дзеці паўтараюць верш цалкам.

З дапамогай педагога выхаванцы вучацца не толькі запамінаць верш, але і ўмець яго выразна выконваць. Педагог паказвае дзецям, дзе чытаць з замілаваннем, дзе з пяшчотай, дзе з пытальнай або клічнай інтанацыяй. Пераймаючы выразнае расказванне педагога, дзеці спрабуюць чытаць вершы з адпаведнай інтанацыяй.

Вершы, якія напісаны ў дыялагічнай форме можна чытаць па ролях і разыгрываць. Пасля завучвання педагог размяркоўвае ролі, тлумачыць дзецям, калі і якую частку верша неабходна чытаць. Чытанне па ролях развівае ўвагу, вучыць сачыць за тэкстам.

Дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту можна адразу знаёміць з некалькімі вершамі розных аўтараў на блізкія тэмы. У гэтым выпадку адзін верш вучаць на памяць, а іншыя проста чытаюцца.

Напрыклад, слуханне вершаў В. Вярбы «Бабуліны казкі», В. Віткі «Бабіны госці» і завучванне верша А. Дзеружынскага «Бабулі». Дзеці з цікавасцю адшукваюць у вершах словы, або выразы, якімі паэты перадаюць адну і тую ж з'яву, параўноўваюць, супастаўляюць моўныя сродкі паміж сабой.

Каб сфарміраваць *элементарнае асэнсаванне жанру*, чытанне і завучванне верша мэтазгодна аб’ядноўваць з чытаннем апавядання або расказваннем казкі. Напрыклад, завучванне верша Д. Бічэль-Загнетавай «Белая Русь» можна спалучаць з чытаннем празаічнага твора В. Сухамлінскага «Цяпер я ведаю, якая Беларусь».

У змест мастацка-маўленчых заняткаў у старшай групе ўваходзіць знаёмства дзяцей з байкамі. Пасля выразнага выканання байкі педагогам праводзіцца кароткая гутарка па яе змесце, якая дапамагае дзецям зразумець спецыфіку жанру. Каб дапамагчы зразумець мараль гэтых твораў, педагог можа нагадаць дзецям які-небудзь падобны выпадак у рэальным жыцці, які дапаможа ім правесці аналогію са зместам байкі.

Адным са сродкаў актыўнага ўспрымання і засваення літаратурнага твора з’яўляецца *ілюстрацыя*. Дзіця яшчэ не ўмее чытаць і яго першае знаёмства з кнігай адбываецца пры дапамозе ілюстрацый.

*Ілюстрацыя ў кнізе* — гэта першая сустрэча дзяцей са светам выяўленчага мастацтва і кніжнай графікі. Выбіраючы кнігу для дзяцей, неабходна ацэньваць яе не толькі як літаратурны твор, але і як непарыўны комплекс слоўнага і выяўленчага мастацтваў. Сярод ілюстратараў дзіцячых кніг ёсць выдатныя мастакі: Т. Беразенская (казкі «Лісіца Хітрыца», «Жаронцы»), Н. Паплаўская (Р. Кіплінг «Чаму ў Слоніка доўгі нос»), М. Селяшчук (зборнік казак «Бацькаў дар»), А. Лось (В. Вітка «Дударыкі») і інш.

Разглядванне ілюстрацый пад кіраўніцтвам дарослых спрыяе эстэтычнаму ўспрыманню і лепшаму ўсведамленню дзецьмі зместу літаратурнага твора. Для малодшых дзяцей змест кнігі часта заключаецца ў ілюстрацыях (гэта так званыя кніжкі-малюнкі), дзе асноўнае месца адводзіцца яркаму малюнку і значна меншае невялікаму вершаванаму тэксту. Разглядаючы малюнкі, яны ў першую чаргу звяртаюць увагу на асноўныя формы малюнка, дэталі ж застаюцца па-за іх увагаю. Больш за тое, дзіця малодшага дашкольнага ўзросту ўспрымае малюнак непасрэдна і канкрэтна. Таму педагогу неабходна звяртаць увагу ў першую чаргу на прадметнасць і псіхалагічную выразнасць ілюстрацый. Прадметы і з’явы ўспрымаюцца дзецьмі як рэальна існуючыя, з якімі хочацца дзейнічаць і размаўляць.

Разглядванню ілюстрацый могуць быць прысвечаны спецыяльныя заняткі. Разнастайнасць прыёмаў, якія педагог выкарыстоўвае падчас іх правядзення, добра ўплывае як на ўспрыманне малымі самой ілюстрацыі, так і на ўспрыманне зместу ўсяго літаратурнага твора. Спалучэнне мастацкага слова з гульнявымі прыёмамі непасрэдна ўплывае на актыўнасць успрымання, развівае назіральнасць і маўленне. Педагог сваімі пытаннямі ўключае дзяцей у спаборніцтва «Хто дакладней разглядзіць карцінку». Калі дзіця заяўляе, што яно больш нікога і нічога не бачыць, педагог падказвае, што яшчэ можна разглядзець.

У сярэднім дашкольным узросце для актывізацыі ўспрымання дзецьмі ілюстрацый асаблівую значнасць набываюць пытанні педагога, якія накіроўваюць увагу на вызначэнне выяўленчых сродкаў выразнасці.

Пры разглядванні ілюстрацый вельмі важна ўмела спалучаць пытанні з тлумачэннямі і абагульненнямі педагога. Яны павінны быць, па магчымасці, вобразнымі і выразнымі, каб стварыць у дзяцей пэўны настрой, выклікаць адпаведныя пачуцці.

З дзецьмі 4—5 гадоў можна праводзіць параўнальнае сузіранне ілюстрацый да аднаго і таго ж твора, якія напісаны рознымі мастакамі або выкананы рознымі паліграфічнымі спосабамі. Калі ў чатырох або пяцігадовым узросце дзеці толькі называюць колер, то шасці-сямігадовых ужо можна падвесці да вызначэння колеру як сродку перадачы пэўнага настрою.

У старэйшым дашкольным узросце дзеці ўжо здольныя да ацэнкі малюнкаў-ілюстрацый. Яны імкнуцца адказаць на пытанні: «Спадабаўся ці не спадабаўся малюнак? Чаму?». Дзецям гэтага ўзросту можна прапанаваць вызначыць, да якога верша ён намаляваны. Пры разглядзе ілюстрацый увага звяртаецца на іх сувязь з жанрам твора. Так, у гумарыстычных творах гумар падаецца ў ілюстрацыях праз адпаведныя жэсты, міміку персанажаў, незвычайнасць сітуацый, дэталяў.

Мастацкая літаратура актыўна ўключаецца ў вядучы від дзейнасці дзяцей — гульню, у дадзеным выпадку — *гульню-драматызацыю*. Мастацкую творчасць, як і гульню, вызначае сам працэс задавальнення дзяцей гэтай дзейнасцю. *Драматызацыя* — гэта разыгрыванне ў ролях мастацкага літаратурнага твора, перадача характэрных рыс яго герояў.

Гульні-драматызацыі даюць шырокую прастору для выяўлення ў дзяцей творчых здольнасцяў, самастойнасці, ініцыятывы. У гульнях-драматызацыях дзеці адлюстроўваюць свае ўражанні аб літаратурным творы, у мастацкіх вобразах увасабляюць яго персанажаў, перадаюць розныя падзеі, якія адбываюцца ў творы. Змест і характар гэтай гульнявой дзейнасці, склад яе ўдзельнікаў цалкам залежыць ад сюжэту мастацкага твора, яго кампазіцыі.

Жывыя інтанацыі маўлення, выразныя і свабодныя рухі, міміка, жэсты надаюць гульням дзяцей натуральнасць і праўдзівасць. Усё гэта, дарэчы, і сведчыць аб наяўнасці ў дзяцей дашкольнага ўзросту здольнасці да гульні-драматызацыі. Пагуляць у такую гульню спачатку прапануе педагог. Аднак для гэтага дзіцяці неабходна глыбока ўсвядоміць мастацкі твор і добра ведаць яго змест, так як гульня-драматызацыя з'яўляецца як бы завяршэннем працэсу яго ўспрымання. Глыбокае асэнсаванне дзецьмі дашкольнага ўзросту ўспрымання твораў слоўнага мастацтва ў далейшым з'яўляецца адной з умоў іх паспяховай драматызацыі.

Па меркаванні Н.С. Карпінскай, дзеці дашкольнага ўзросту дакладна і поўна разумеюць змест мастацкага твора, вызначаюць план сваіх дасягненняў па выкананні ролі, аднак у іх адсутнічаюць уменні і навыкі творчай рэалізацыі гэтай ролі ў працэсе гульні. З мэтай развіцця творчых здольнасцяў выхаванцаў яна прапануе вучыць дзетак спецыяльным мастацкім уменням і навыкам, сярод якіх значнае месца займаюць навыкі выразнасці і вобразнасці мовы. Дзеці вучацца суадносіць свае асабістыя маўленчыя і выяўленчыя дзеянні з дзеяннямі ўсяго калектыву.

Для развіцця творчых здольнасцяў можна прапанаваць наступныя заданні: *выканаць з рознай інтанацыяй невялікую фразу ці мастацкі тэкст (сумна, радасна, здзіўлена); сказаць невялікую фразу з рознай сілай голасу; прачытаць вершаваныя радкі пэўным тонам і зададзенай тэмбравай афарбоўкай і інш.*

У дзяцей 4—5 гадоў развіццё творчых здольнасцяў адбываецца ў працэсе сеансаў актывізуючых зносін падчас мастацка-маўленчай дзейнасці.

З дзецьмі старэйшага дашкольнага ўзросту гульні-драматызацыі праводзяцца ў час самастойнай мастацка-маўленчай дзейнасці, звычайна ў другой палове дня. Дзеці старшай групы могуць драматызаваць творы як для сябе, так і для маленькіх гледачоў, для сваіх бацькоў. Пасля чытання ці апавядання мастацкага зместу педагогам дзеці пераказваюць яго, каб лепш запомніць сюжэт. Пры гэтым ім не трэба паказваць, як паводзіць сябе ад імя таго ці іншага героя, каб не стрымліваць іх творчай самастойнасці. Усе намаганні педагога накіраваны на развіццё ў дзяцей самастойнай творчасці пры выкананні роляў і асэнсаванні зместу мастацкага твора. У ходзе спецыяльнай гутаркі педагог высвятляе, як дзіця разумее сваю ролю, вонкавы выгляд і характар героя, ці падабаецца ён дзіцяці; прапануе паказаць, як рухаецца персанаж і інш.

Да гульні-драматызацыі неабходна падрыхтаваць разам з дзецьмі атрыбуты, элементы касцюмаў. Яны ўзмацняюць уяўленне дзяцей, уносяць радасць і яркасць у гульню. У гульнях-драматызацыях прымаюць удзел усе дзеці. Гульню-драматызацыю можна праводзіць дватры разы, кожны раз з новым складам удзельнікаў. У малодшай групе педагог сам размяркоўвае ролі паміж дзецьмі. Размеркаванне роляў у старшай групе праходзіць калектыўна. Педагог кіруе гульнёй, нагадвае і ўдакладняе змест мастацкага твора, сочыць за дакладнасцю вобразаў. Ён можа ўзяць якую-небудзь ролю і сабе. Ініцыятарамі правядзення гульні-драматызацыі могуць выступаць і дзеці старэйшага дашкольнага ўзросту.

Акрамя гульні-драматызацыі ва ўстанове дашкольнай адукацыі праводзіцца яшчэ і *інсцэніраванне мастацкіх твораў*, якое ўяўляе сабой дакладнае і паслядоўнае адлюстраванне літаратурнага тэксту. У адрозненні ад гульні-драматызацыі інсцэніраванне патрабуе спецыяльнага завучвання тэксту. Яго праводзяць толькі з дзецьмі старшай групы, звычайна падчас правядзення літаратурных ранішнікаў, канцэртаў, святаў. Пры інсцэніраванні літаратурных твораў неабходна абавязкова выкарыстоўваць дэкарацыі, атрыбуты, касцюмы. Тут, як правіла, ёсць вядучы, які чытае словы аўтара. З інсцэніраваннем дзеці могуць пазнаёміцца падчас слухання мастацкага твора ў выкананні сапраўдных майстроў.

У кожнай узроставай групе ўстановы дашкольнай адукацыі пажадана арганізаваць *цэнтр маўленчай актыўнасці*. Гэтае месца неабходна зрабіць для выхаванцаў самым цікавым і ўтульным. Асноўнае месца ў ім займае *кніжны куток*. Прызначэннем кніжнага кутка з'яўляецца выхаванне цікавасці і паважлівых адносін да кнігі, замацавання навыкаў карыстання ёю. Пажадана размясціць і абсталяваць кніжны куток у добра асветленым месцы групавога пакою. Кнігі ў ім могуць знаходзіцца на спецыяльных паліцах або ў шафе. Тут можна пацікавіцца і дзіцячымі часопісамі, ілюстрацыямі мастакоў да літаратурных твораў. У кніжным кутку можна размясціць карціны або рэпрадукцыі да любімага мастацкага твора, партрэт пісьменніка, якога дзеці добра ведаюць. Разам з тым ён можа стаць месцам для размяшчэння розных тэматычных выстаў.

Арганізацыя такога кутка ў кожнай групе мае свае асаблівасці. У другой малодшай групе выстаўляюцца добра знаёмыя ілюстраваныя мастацкія творы, кніжкі-шырмы, кніжкі-карцінкі, наборы прадметных малюнкаў. У гэтай групе педагог сам сочыць за парадкам. У прысутнасці дзяцей раскладвае кнігі, рамантуе іх, паказвае, як гартаць старонкі, разглядае з выхаванцамі ілюстрацыі, назірае, каб дзеці бралі кнігі чыстымі рукамі і інш.

Для дзяцей сярэдняга дашкольнага ўзросту акрамя кніг на паліцах выстаўляюцца альбомы з ілюстрацыямі, фотаздымкамі. Выхаванцы могуць вырабляць такія альбомы разам з педагогам ці бацькамі.

У старэйшай групы колькасць кніг павялічваецца. Добра, калі маецца невялікая кніжная шафа для захоўвання кніг, дзіцячых часопісаў, альбомаў. Са старэйшага дашкольнага ўзросту ўводзяцца дзяжурствы дзяцей па кніжным кутку. У абавязкі дзяжурных уваходзіць праца па навядзенні і падтрыманні парадку. Па жаданні дзяцей дзяжурныя выдаюць ім кнігі. Калі гэта неабходна, дзеці займаюцца рамонтам кніг.

Акрамя таго, у цэнтры маўленчай актыўнасці ў групавым пакоі неабходна вызначыць прастору, дзе можна было б ладзіць розныя літаратурныя гульні, віктарыны, ажыццявіць прэзентацыі-паказы новай кнігі, сюжэтна-дыдактычныя гульні па матывах дзіцячай паэзіі і прозы, сюжэтна-ролевыя гульні: «Бібліятэка», «Кнігарня», «Тэатр», «Канцэрт», рэжысёрскія гульні па матывах літаратурных твораў і г.д.

**Заключэнне.** Знаёмства з мастацкімі творамі спрыяе развіццю ў дзяцей эстэтычнага ўспрымання тэксту, пачуцця гармоніі, прыгажосці, выхаванню мастацкага густу, здольнасці эмацыйна адгукацца на вобразную гаворку. Мастацка-маўленчую дзейнасць ва ўстанове дашкольнай адукацыі трэба наладзіць такім чынам, каб выхаванцы не толькі пачулі мастацкі твор, але і адчулі яго ў сваіх сэрцах.

Паступіла ў рэдакцыю 12.01.2015 г.

ЛІТАРАТУРА:

1. *Белинский, В.Г.* Избранные статьи / В.Г. Белинский. — М.: Детская литература, 1972.
2. *Гриценко, З.А.* Литературное образование дошкольников / З.А. Гриценко. — М.: Академия, 2012.
3. *Стародубова, Н.А.* Теория и методика развития речи дошкольников / Н.А. Стародубова. — М.: Академия, 2007.
4. *Смирнова, Е.О.* Дошкольник в современном мире / Е.О. Смирнова. — М.: Дрофа, 2006.